**КОЛЯСКУ-ДЖИП** «Рико», 3 в 1, цвет серый, с фиолетовыми вставками, состояние хорошее. Тел. 5-17-15, 8-029-111-57-87.

**КОЛЯСКУ** детскую, 3 в 1, с автокреслом. Тел. 8-029-675-65-42.

**КОЛОНКУ** газовую, 2006 г.в., б/у, эксплуатация 1 день. Тел. 8-029-356-18-07.

**КОЛЯСКУ** детскую, джип, 3 в 1, 850000 руб. Тел. 8-029-125-68-56.

**ЛОДКУ** ПВХ «Барк-2804» и мотор «Тахатсу», 3,5 л/с, Япония. Тел. 8-029-643-92-51.

**МАТРАС** ортопедический, чешский, б/у, 2-спальный, 1600000 руб. Тел. 8-029-646-48-26.

**МАСКУ** для сварки, хамелеон, 35 у.е. Тел. 8-029-147-89-16.

**ПАВИЛЬОН** торговый, на рынке «Наш Край», пл. 12 м², крытый, эл. счётчики, можно в аренду, возможен обмен на гараж. Тел. 8-029-604-53-65.

**ПАВИЛЬОН** металлический, на ул. Брестской, 107/3, р-н школы №8, общ. пл. 24,0 м² + кондиционер-инвертор, 80,0 млн. руб., возможна сдача в аренду. Тел. 8-044-594-91-20, 8-044-594-91-15.

**ПАВИЛЬОН** торговый, в д. Жировичи, в центре, имеется электричество, канализация, торговое оборудование, тепловое оборудование. Тел. 8-029-647-68-14.

**РОЛЛЕТ,** на центральном рынке, на ул. Школьной, 2, в непродовольственном ряду, 3 м х 5 м, или сдам в аренду, срочно! Тел. 8-029-588-28-04, 8-029-397-77-39.

# МЕНЯЮ

**КВАРТИРУ** 1-комн., 2-й этаж, балкон, подвал, кладовая, на 3-комн. квартиру. Тел. 8-044-532-41-56, 8-029-974-61-51.

**КВАРТИРУ** 1-комн., 1-й этаж, без балкона, общ. пл. 27,7 м², на дом или полдома, в р-не города или на окраине. Тел. 8-029-883-14-73.

**КВАРТИРУ** 1-комн., на ул. Красноармейской, д. 83, 3-й этаж, на 2-3-комн., в р-не СШ №5, военный городок, с доплатой 5000-7000 у.е. Тел. 4-73-51, 8-033-310-69-18, 8-029-347-17-66.

**КВАРТИРУ** 2-комн., на Энке, 1-й этаж, на квартиру 3-комн., на Энке, с доплатой, 1-й и 5-й этажи не предлагать. Тел. 8-044-533-29-19, 8-029-888-10-78, 5-03-67.

**КВАРТИРУ** 2-комн., с ремонтом, на ул. Ф. Скорины, на квартиру 3-комн., без ремонта, на Энке. Тел. 8-029-286-00-66.

# КУПЛЮ

## недвижимость

**КВАРТИРУ** 1-2-комн., можно без ремонта. Тел. 8-029-888-19-61.

**КВАРТИРУ** 1-комн., 1-й этаж, либо в доме с лифтом, за разумную цену, можно без ремонта. Тел. 8-044-775-18-81.

**КВАРТИРУ** 2-комн., можно без ремонта, до 30000 у.е. Тел. 8-033-671-66-97, 8-044-546-61-81.



**КВАРТИРУ** 1-2-комн., в р-не ул. Тополёвой, Брестской, Ершова, пр. Независимости, Ф. Скорины. Тел. 8-029-584-36-64, 8-029-789-77-04.

## авто

**АВТО,** любой марки, модели, любого года выпуска, бензин, дизель, газ, в любом состоянии, аварийный, целый или на запчасти, рассмотрю любые предложения, звоните в любое время, выезд в любой регион, быстро, дорого, срочно. Тел. 8-029-110-30-13, 8-029-258-70-49.

**АВТО** любое, можно с проблемами. Тел. 8-033-690-91-95, 8-044-472-79-90.

## разное

**ЛОТЕРЕЮ** «Капитал» с буквами СРЩ за вознаграждение. Тел. 8-033-624-71-33, 4-87-43.

**ДИСКИ** железные, R14-R16. Тел. 8-029-672-09-56.

**КАБАНЧИКА** живым или чистым весом. Тел. 8-025-658-75-84.

**НОУТБУК,** б/у или новый, срочно. Тел. 8-029-792-68-94.

**ШИНЫ** грузового авто, с/х техники, запчасти к ним, подшипники, электроды, лемех, отвал. Тел. 8-033-322-21-43.

**ЭЛЕКТРОИНСТРУМЕНТ,** для строительства, б/у. Тел. 8-044-538-24-72.

# РАЗНОЕ

**ПРОПАЛА** собака в р-не Рыщицы, малой породы, рыже-белый окрас, кобель, длинношерстная, коричневый ошейник, нашедшего просьба позвонить, вознаграждение гарантировано. Тел. 8-029-584-52-96, 8-025-953-40-50.

**ПОТЕРЯЛАСЬ** собака, небольшая, гладкошёрстная, белая, хвост и ушки с рыжеватым оттенком, потерялась в р-не 7-й Переезд, откликается на кличку Чип, нашедшего или того, кто, возможно, видел, прошу позвонить. Тел. 8-029-585-07-19, 8-044-779-70-32.

**ВОЗЬМУ** попутно в Москву из Барановичей. Тел. 8-029-208-54-44.

**ПРОШУ** вернуть за вознаграждение техпаспорт на автомобиль на имя Лобырина П.В. Тел. 8-029-947-44-39.

# ВАЙНА ВУСНАМІ ТЫХ, ХТО ВАЯВАЎ

**Гэта распаведы ўдзельнікаў савецка-афганскай вайны, якія патрапілі туды ў першы год акупацыі Афганістана Савецкім Саюзам.**

Быў 1983 год. З 3 да 12 сакавіка Мастоўскі райваенкамат праводзіць перападрыхтоўку афіцэраў запасу. Перападрыхтоўку прыехалі праводзіць пяць афіцэраў з гарадзенскай дывізіі.

Пасля кароткага выступу камісара Мастоўскага раёна заняткі распачаў нампаліт аднаго з падраздзяленняў вайсковай часці маёр Зімін. Яскрава падаў пра баявы дух воінаў савецкіх узброеных сіл, з якога пасміхаліся слухачы курсаў, ды закончыў лекцыю армейскім анекдотам, які ўсім спадабаўся. Змест яго такі. У вайсковую часць з Акадэміі Генеральнага штаба прыязджае генерал з лекцыяй "Заганныя норавы савецкага грамадства". "На першым месцы па разбэшчанасці — чыноўнікі. Яны больш за іншых п'юць, гуляюць ды яшчэ крадуць. Па амаральных паводзінах другое месца займаюць студэнты. А вось, як ні сумна, мы, таварышы афіцэры, тут на трэцім месцы". У гэты момант падымаецца маёр ды супярэчыць генералу: "Гэта не праўда! Вось, прыкладам, я амаль 20 гадоў жыву з жонкаю. П'ем па святах. Я ніколі з другою кабетаю не быў..." Тут падымаецца лейтэнант. Пасля ўчарашняга твар пакамечаны, пагалены абы-як, і абураецца на маёра: "Вось з-за такіх, як вы, мы на трэцім месцы".

Трэцім чатырохгадзінную лекцыю трымаў капітан разведвальнай роты Аксанчыц, які толькі-толькі вярнуўся з Афгана, дзе адваяваў два гады. З першага слова капітана стала зразумела, што ў яго іншае бачанне стану тагачасных узброеных сіл. Ён ні словам не абмовіўся аб тэме заняткаў, а ад першай і да апошняй хвіліны казаў пра набалелае, пра Афган і інтэрнацыянальны доўг называў адкрыта вайною.

Камандзір падраздзялення з чатырма салдатамі заходзіць у кішлак. Іх заклікалі ў госці. Камандзіра запрашаюць у адзін пакой, салдатаў — у другі. Лінулі гарачым чаем у вочы і распачалі расправу: распаролі жываты, адрэзалі вушы. Трупы таемна закапалі. У таго афіцэра там жа, у Афгане, служыў брат, камандзір палка. Іх дзядзька займаў важную пасаду ў Генеральным штабе. Брат падымае па трывозе полк, акружаюць кішлак. Усіх людзей выводзяць на пляц і загадваюць паказаць, дзе закапаны трупы. У адказ — маўчанне. Расстрэльваюць і старых, і малых. Такім чынам правялі расправу яшчэ ў адным кішлаку. Акружылі трэці. Расстралялі амаль усіх. Тут адзін стары ўпаў на калені, просячы літасці, ды паказаў, дзе закапаны знявечаныя трупы. Цераз яго духі перадалі запіску, што знішчаць адзін кантрольна-прапускны пункт. Гэтыя пункты знаходзілі паўсюдна на дарозе ад пагранічнага Тэрмеза да Кабула. Неўзабаве тое адбылося.



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Закончыўшы гэты расказ, капітан са свежым шнарам на шчацэ запытаў нас: "Пасля гэтага мы не фашысты?"

Кожны груз, нават мірны, які дастаўляўся з Саюза ў Афган, суправаджаўся савецкімі вайскоўцамі. На адну з такіх калонаў напалі маджахеды. Вадзіцелі, суправаджальнікі павыскаквалі з машынаў. Занялі абарону. Адбілі напад. Сабраліся. Аднаго афіцэра недалічыліся. Калона рушыла. Той афіцэр са страху не мог у свой час вылезці з-пад БТР і прапоўз пад ім некалькі кіламетраў.

Яшчэ адзін эпізод той жудаснай вайны. Маджахеды напалі на калону, якая рухалася з Саюза ў Афган. Абстралялі яе. Адбілі аўтобус, у якім ехалі афіцэры і медычкі. Афіцэраў замардавалі. Дзяўчат згвалтавалі, адрэзалі грудзі і забілі.

Ужо на самым пачатку той вайны нажываліся як маглі. Два прапаршчыкі, якія суправаджалі машыны, што дастаўлялі грузы ў Афган, дамовіліся з камбатам наконт звычайнага тавараабмену. Тыя кантрабандна дастаўлялі вайскоўцам гарэлку і цыгарэты (адна пляшка гарэлкі там каштавала да 50 рублёў). Адтуль везлі розныя тавары, у тым ліку джынсы, кошт якіх па тых мерках сягаў за 200 рублёў. Грошай зарабілі шмат, аднак падзяліць не змаглі ды ў Тэрмезе ў гасцініцы з-за таго ўчынілі бойку. Што і стала вядомым.

Чатыры салдаты з афіцэрам зайшлі ў пустую хату. Толькі прыселі, як адчыняюцца дзверы. Яны туды чаргу з аўтамата. Дзверы зачыніліся. Адстрэльваліся некалькі гадзін. Выратаваў зампаліт. Ён выклікаў агонь на сябе. Зампаліт загінуў, а салдаты такім чынам выскачылі з гэтай пасткі.

Разведрота загінула па віне аднаго салдата. Ён, каб не насіць цяжкую радыёстанцыю, узяў асла і прывязаў яе да жывёліны. Іх абстралялі. Асёл уцёк. Потым яго застрэлілі, але падпаўзці да радыёстанцыі, каб выклікаць дапамогу, было немагчыма. Потым па войсках пайшоў чорны жарт: "загінулі з-за двух аслоў".

І вядома, які афіцэр не распавядае анекдотаў пра войска і ўсё звязанае з ім. Распавядаў іх і капітан. Толькі гэта гумар тых, хто ваяваў. І яны з'явіліся на самым пачатку тае вайны.

Узялі духі савецкага салдата ў палон. Адрэзалі ўсё, што можна, ды пытаюць: "Табе баліць?" Ён адказвае: "Крышку. Як смяюся".

Па горнай сцежцы ідзе мусульманін. Паперадзе яго гарэм. Насустрач прававерны, ды кажа яму: "Гэта не па Каране. Ты павінен ісці паперадзе". Той адказвае: "У Каране не напісана, што на сцежках могуць быць міны".

Ніхто з аўдыторыі не ўсміхнуўся з тых жартаў.

Дзесьці ўлетку таго года мне давялося ляцець самалётам з Гродна ў Кіеў. Наперадзе мяне ў крэслах сядзелі муж і жонка. Ён быў апрануты па-цывільнаму, але меў вайсковы выгляд. Яна некалькі разоў пытала мужа, чаму ён не распавядае пра службу ў Афганістане. Урэшце мужчына не вытрымаў і сказаў: "Хочаш ведаць пра вайну — паглядзі кіно, хоць крышку пра яе даведаешся".

Язэп ПАЛУБЯТКА

Каждый день следует прослушать хоть одну песенку, посмотреть на хорошую картину и, если возможно, прочитать хоть какое-нибудь мудрое изречение.
Иоганн Вольфганг Гёте

БАЦЬКАЎШЧЫНА

# АГІНСКІ КАНАЛ У ЧАСЫ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**У часы Расійскай імперыі аднаўлены Агінскі канал з'яўляўся важным элементам так званай Агінскай сістэмы, у якую таксама ўваходзілі рэкі Ясельда і Шчара. У дачыненні да азначаных водных шляхоў сустракаецца і назва Агінска-Нёманская сістэма, паколькі іх лёс быў павязаны з Нёманам, праз які тавары з Валыні, Падняпроўя, Піншчыны і Слонімшчыны накіроўваліся ў Заходнюю Еўропу.**



Агінскі канал, 1917 год

Пасля знішчэння Рэчы Паспалітай улады Расійскай імперыі паступова ўводзілі свае парадкі ў Заходняй Беларусі. З пачаткам панавання Паўла I яны звярнулі ўвагу на "амаль забыты" Агінскі канал і вырашылі прыступіць да яго рамонту "з мэтаю прынесці больш выгоды расійскім падданым".

**АДРАМАНТАВАЛІ**

У 1799 годзе пачаліся рамонтныя працы, якія планавалася завяршыць у 1802 годзе. На іх штогод выдаткоўвалася па 60 тысяч расійскіх рублёў, узятых з сум, прызначаных першапачаткова на будаўніцтва Марыінскага канала. Аднак працы па аднаўленні канала працягваліся яшчэ і ў 1803 годзе, а для суднаходства той афіцыйна быў адкрыты 10 красавіка 1804 года. З гэтай нагоды 31 жніўня Сенат Расійскай імперыі выдаў "указ аб адкрыцці Агінскага ў Літоўскай імперыі канала", у якім адзначалася:

— канал складаўся з 10 дворных і аднаго водаўтрымальнага шлюзаў, а таксама 4 мастоў;

— канал мог прапускаць судны даўжынёю не большай за 11 сажняў, шырынёю да 15 англійскіх футаў і глыбінёй 2,5-3 футы.

Таксама для паляпшэння ўмоў суднаходства па Агінскім канале ў адпаведнасці з рашэннем Сената дадаткова прадугледжвалася прывядзенне ў парадак берагавых палос і ўпарадкаванне па рэках Прыпяць, Гаруна, Шлюдцы, Ясельда, Струмень і Піна: млыны і глухія масты не павінны былі перашкаджаць суднаходству і выклікаць спыненні суднаў і плытоў. Перамяшчэнні грузаў па Агінскай сістэме звычайна працягваліся да канца верасня — пачатку кастрычніка.

Вялікай праблемай для інжынераў, якія аднаўлялі канал, сталася тое, што ён быў прарыты ў балоцістай глебе, ілістай, і толькі ніжняя яго частка, бліжэйшая да Ясельды, мела пясчаную глебу. Дадатковая складанасць заключалася ў тым, што Выганаўскае возера, якое ўваходзіла ў Агінскую сістэму, было вельмі плыткае (каля двух аршынаў у глыбіню), берагі яго былі тарфяністыя, дно на большую глыбіню складалася з вадзяністага ілу. Таму пры хваляваннях выхад канала з возера ў бок Ясельды засмечваўся, у сувязі з чым каля вусця канала, у бок возера, была зроблена простая шандорная плаціна. Таксама ў сувязі з недастатковасцю вады Выганаўскага возера як рэзервуара меўся план уключэння ў якасці запасных вод для Агінскага канала азёр Бабровіцкага і Соміна.

**ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ КАНАЛА**

Праведзеная расійскімі ўладамі адбудова Агінскага канала дала яму другое жыццё, і ў 1810-1820-я гады назіраўся шпаркі рост кошту тавараў, якія па ім транспартаваліся, што садзейнічала аднаўленню краю пасля вайны 1812 года. Гэта быў час, калі палескія пушчы былі багатыя на велічэзныя векавыя дрэвы, і таму па канале сплаўляўся пераважна лес. Восем гадоў у Коўна выпраўлялі дрэва з Валыні для французскага флоту. Рыжскі гандляр Леанард Берхгальд зарабіў на гэтым вялізныя для таго часу грошы — 4 мільёны польскіх злотых.

У 1829 годзе Польскі банк накіроўвае на Палессе, развіццю якога садзейнічаў Агінскі канал, аднаго са сваіх служачых — Казіміра Кантрыма (1762-1836). Перад Кантрымам была пастаўлена задача даследаваць гаспадарчыя і гандлёвыя адносіны краю. Аднак ён зрабіў значна больш, пакінуўшы цікавае сачыненне пра падарожжа на Палессе, дзе падрабязна апісаў сплаўны і плытавы гандаль. Тут жа Кантрым адзначыў, што па Агінскім канале "ў адзін год падчас праходу плыты рознага дрэва расцягнуліся неперарывальнаю палоскаю адназванага возера [Гарадыйскага возера] аж да Слоніма, і болей як на міль 30 як па мосце ўздоўж па іх можна было праходзіць".

Вялікая колькасць лесу, што сплаўляўся, патрабавала неабходнай колькасці працоўных — плытароў. Гэта была вельмі цяжкая фізічная праца, якая патрабавала ад чалавека дасканалага ведання маршрута. Паступова з'яўляліся цэлыя сем'і плытароў, майстэрства якіх перадавалася ў спадчыну. Згодна з Кантрымам, "усе пры якім-небудзь сплаве людзі, абавязаныя, кожны асобна, мець пашпарты, і мяшчане і сяляне паводле асаблівай на тое формы і кошту. Сялянам даюць пашпарты паны, або паўнамоцныя, і папера каштуе штомесячна па капеек 50 асыгнацыйных, што выходзіць на злоты срэбрам. Пасля заканчэння тэрміну пашпарта, праз адзін месяц можа быць селянін без новага пашпарта, і гэта называецца хота альбо льгота".

Хутка раслі населеныя пункты, якія злучаў Агінскі канал. Перш за ўсё Слонім і Целяханы, у апошнім з якіх знаходзіліся рамонтныя і суднабудаўнічыя майстэрні, дзе выраблялiся пласкадонныя баркі і паўбаркі рознага водазмяшчэння. Увогуле ў 1836 годзе праз Агінскі канал было правезена тавараў на паўтара мільёна рублёў. Акрамя дрэва, гэта былі соль, пшаніца, жыта, авёс, ільняное семя, воцат, гарох, гліняныя і фаянсавы посуд, шкло, цэгла, тытунь, якія ішлі на экспарт, а прывозілі шоўк, віно, жалеза і вырабы з каштоўных металаў.

У сувязі са скарачэннем плошчаў лясоў на Палессі і Валыні, зменшыліся яго пастаўкі праз Агінскі канал у Коўна і Кёнігсберг. Адначасова павялічваецца колькасць збожжа (хлеба), якое сплаўлялася каналам на Захад. Аднак залежнасць ураджаяў ад прыродных умоў адмоўна ўплывала на тэмпы развіцця гандлю на Агінскім канале.

Цяжкімі для яго выдаліся 1840-я гады. З 1843 года ў сувязі з трохгадовым неўраджаем (1844-1846) у Еўрапейскай частцы Расійскай імперыі суднаходства зменшылася на ўсіх рэках, па якіх сплаўляўся хлеб за мяжу, у першую чаргу па Нёмане і Шчары. Часам здараліся моцныя паводкі, і ледаход на канале і Шчары, як у 1846 годзе, калі былі знішчаны масты на рацэ і на 8 дзён спынены рух 2-й лёгкай кавалерыйскай дывізіі ва Украіну. А ў 1847 годзе здарылася новая пошасць — плытаводдзе з-за бяссненжай зімы і сухога лета. У выніку чатыры судны пацярпелі крушэнні на Нёмане і адно — на Шчары.

У 1848 годзе ў сувязі з рэвалюцыямі ў Еўропе адпраўка грузаў па Нёмане і Шчары ўвогуле спынілася. У выніку Агінскі канал у гэты час абслугоўваў толькі ўнутраныя патрэбы Гродзенскай губерні. З-за моцнай засухі прыйшлося спусціць Выганаўскае возера, каб павялічыць узровень вады ў канале, што аказалася недастатковай мерай. У сувязі з гэтым з'явілася прапанова зрабіць на рацэ Шчары дзве вадаёмныя разборныя плаціны — адну з іх перад упадзеннем у Шчару рэчкі Ісы, другую — пасля вёскі Парэчча. Быў складзены таксама праект пра паляпшэнне рэчышча Нёмана за кошт ачысткі плыткіх месцаў, капання пратокаў, знішчэння небяспечных быстрыняў, выцягвання камянёў і калодаў. Але нічога з гэтых прапаноў і праектаў так і не было рэалізавана, таму што ў 1849 годзе прыродныя ўмовы значна палепшыліся, у выніку па Агінскім канале прайшло тавараў коштам 246288 рублі 95 капеек. У асноўным гэта быў лес, смала, дзёгаць і вугаль, які нарыхтоўваўся ў Гродзенскай і Мінскай губернях. З Крэменчуга праз Пінск атрымлівалі значную колькасць солі, якую перавозілі на пласкадонных вялікіх лодках, якія мелі 8-16 сажняў даўжыні і 2,5-3 сажні шырыні.

У 1851 годзе з-за дажджлівага лета выдаўся вельмі дрэнны ўраджай, што замарудзіла тэмпы развіцця суднаходства. З 1852 года зноў назіраецца значны рост плытоў і суднаў у Агінскім канале. Як вынік: на Шчары разбіліся 2 баркі і адно судна. У 1853 годзе на рацэ патанулі двое суднарабочых. У 1854 годзе зноў здарыўся неўраджай: калі ў папярэднім 1853 годзе праз канал прайшлі 2739 плытоў, 17 чаек (барак) і 34 лодкі, то ў 1854 годзе толькі 1998 плытоў, 3 чайкі, затое 140 лодак. У 1850-х гадах у сярэднім за год праз Агінскі канал праходзіла па дзве тысячы плытоў, а ў 1855-1856 тут рэзка ўзрасла колькасць лодак, якія перавозілі грузы вагой да 800 пудоў: 1855-ы — 246, 1856-ы — 281, аднак з 1857 года іх лічба так жа рэзка скарацілася — да 69, а ў 1858-м увогуле толькі 17.

З'яўляюцца прапановы выкарыстоўваць канал і для руху параходаў. Гэтаму садзейнічаў прыклад, ажыццёўлены памешчыкам Віленскай губерні Тызенгаўзам на рацэ Нёман, дзе пасля ачышчэння ад лёду ў 1856 годзе з'явіліся чатыры параходы, якія выкарыстоўваліся для вывучэння фарватэру.

У 1857 годзе ў адным з партоў Агінскага канала — Слоніме — грузіліся 15 суднаў і 280 плытоў, на якіх працавала 600 чалавек, кошт грузу быў 76480 рублёў. Праз сам жа Слонім прайшло ў гэты год 80 суднаў, з якіх 67 тут разгрузілі, і 2294 плыты, з якіх разгрузіліся толькі 10.

**Васіль ГЕРАСІМЧЫК**

**Працяг у наступным нумары**

# СТОИТ ЛИ ПРИНИМАТЬ БИОЛОГИЧЕСКИ АКТИВНЫЕ ДОБАВКИ К ПИЩЕ

**Что такое сбалансированное питание, мультивитамины и почему это все полезно, сегодня может рассказать любой, кто хоть немного интересуется собственным здоровьем. Нынешняя мода на здоровый образ жизни — явление, безусловно, позитивное. Но мода модой, а во всем, что непосредственно касается нашего здоровья, следует хорошо разобраться, чтобы не стать очередной жертвой.**



## ТАКОЕ ЛИ ПРАВИЛЬНОЕ ПРАВИЛЬНОЕ ПИТАНИЕ

Правильное питание, которое ассоциируется у нас с потреблением овощей, фруктов и прочих продуктов, содержащих необходимые организму витамины и микроэлементы, работает, как правило, в теории. На практике должного количества полезных веществ мы не получаем. Объяснения тому тоже очень простые.

Начнем с того, где мы обычно покупаем продукты для правильного питания. Это за редким исключением супермаркеты и сетевые магазины. Даже если покупать продукты на рынке или «у бабушек», где все предположительно натуральное и фермерское, на самом деле большая часть продуктов будет с той же овощебазы, и у вас все равно не будет никаких гарантий. В России пока, к сожалению, нет официальной организации, сертифицирующей органическую продукцию.

Сегодня значительная часть земель, используемых под сельское хозяйство, истощена, а сорта продукции, выращенные на таких почвах, хороши только с точки зрения владельца супермаркета, так как хорошо хранятся и долго не теряют товарный вид. Однако содержание витаминов в них оставляет желать лучшего.

Поэтому важно, чтобы продукты, которые мы потребляем, как минимум были выращены на полноценных здоровых почвах.

Нелишним будет упомянуть и тот факт, что обычно продукты доставляют в магазины после достаточно длительного периода транспортировки и хранения. Добираться до прилавка они могут не то что неделями, а месяцами. Если предположить, что все это время они просто дозревают в ящиках, а не на ветках, можно представить, какое количество полезных веществ они при этом недополучили и дополнительно утратили.

Чем в магазинах богаты мясные и молочные продукты массового производства, говорить не приходится: всевозможные антибиотики и гормоны, попадающие в организм вместе с этой пищей, не добавляют здоровья.

Но даже если предположить, что вся еда, которую мы потребляем, экологически чистая и качественная, не факт, что и в этом случае мы получаем должную дозу микроэлементов.

Существует 13 нужных человеку витаминов, которые наш организм не может синтезировать самостоятельно или синтезирует в недостаточном количестве, и 16 минералов, необходимых нам для нормального функционирования организма.

Чтобы быть уверенным, что вы употребили за день 100% рекомендованной суточной нормы каждого микроэлемента, вам придется потратить много времени на ведение статистики, а общий калораж всех потребляемых вами продуктов в течение дня, скорее всего, станет избыточным и приведет к лишнему весу.

Оптимальным выходом из сложившейся ситуации может стать прием качественных биологически активных добавок к пище. К сожалению, биологически активные добавки, или БАД, за последнее время обрели негативную репутацию и обросли большим количеством мифов благодаря недобросовестным поставщикам и пустым рекламным обещаниям.

И напрасно. Сегодня на рынке существует множество действительно качественных продуктов. Важно просто научиться отделять зерна от плевел.

## КАК ПРАВИЛЬНО ВЫБРАТЬ КАЧЕСТВЕННУЮ И ЭФФЕКТИВНУЮ БИОЛОГИЧЕСКИ АКТИВНУЮ ДОБАВКУ К ПИЩЕ

Так же, как и с продуктами, здесь стоит разбираться, что действительно пойдет на пользу, а что только навредит. Прежде всего, с подозрением следует относиться к добавкам, в которых представлен весь спектр витаминов и минералов сразу. Важно знать, что некоторые микроэлементы конфликтуют между собой и могут препятствовать должному усвоению.

Во-вторых, выбирая между биологически активными добавками химического или натурального происхождения, всегда следует отдавать предпочтение последним. Даже получая высокотехнологичными методами нужные организму микроэлементы, нам не удастся сделать их настолько же легко усваиваемыми, сбалансированными и биодоступными, как когда они поступают в организм в составе фруктов, овощей и трав.

К тому же в составе фруктов и овощей присутствует множество полезных фитохимических веществ, которые могут снизить риск возникновения сердечно-сосудистых заболеваний, образования раковых клеток, а также могут оказаться прекрасными антиоксидантами.

## КАК РАСПОЗНАТЬ КАЧЕСТВЕННУЮ НАТУРАЛЬНУЮ БИОЛОГИЧЕСКИ АКТИВНУЮ ДОБАВКУ

Однако и с натуральными растительными добавками не все так просто. Безусловно, ингредиенты таких добавок в идеале должны быть выращены в экологически чистых условиях, в местах, где выращивание данной культуры климатически и географически естественно.

Важно и то, каким образом сырье для препарата перерабатано. Как правило, для этого продукты либо подвергают высоким температурам (в том числе сушке на солнце), либо обрабатывают химическими реагентами, после чего еще и отправляют под пресс, разрушая клеточную структуру продукта. Такие методы могут существенно изменить свойства продукта, при этом не всегда в лучшую сторону.

Существует еще один способ переработки — сухая быстрая заморозка, или сублимационная сушка. На высокотехнологичном оборудовании продукты быстро замораживают до температуры от -100 до -190 градусов. В результате вода в них превращается в мелкие кристаллы, которые сразу же переходят в состояние пара.

Данный метод переработки, который еще называют «фриздрай» (freeze-dry), сохраняет максимально возможное количество витаминов, минералов и фитоэлементов, а также не разрушает клеточную структуру растительного сырья.

Затем препарат мгновенно запаковывают в вакуумную упаковку. Это защищает биологически активную добавку от воздействия влаги, кислорода и бактерий.

Кроме того, качественные натуральные добавки редко бывают приятными на вкус. Если препарат сладкий или резко пахнет, к примеру, апельсином, это означает, что в него был добавлен подсластитель и ароматизатор.

Другой вопрос, действительно ли вам стоит принимать добавки в пищу. Как шутят врачи, обычно пить витамины хотят те, кто в этих витаминах не нуждается. Однако есть несколько категорий людей, которым стоит задуматься о приеме таких препаратов следует. В их числе спортсмены, вегетарианцы, люди, сидящие на диете или просто несбалансированно питающиеся, а также люди, подверженные стрессам, и те, кто питается нерегулярно и на бегу.

При этом производители, которые заботятся о своем потребителе, никогда не предложат биологически активные добавки от всех бед на свете. Средство «от всего», как правило, действует по принципу «одно лечим — другое калечим».

Поэтому, выбирая добавку для себя, необходимо определиться, что конкретно вас не устраивает в вашем самочувствии, и подбирать витамины непосредственно под проблему.

Следует помнить, что биологически активные добавки к пище не являются лекарственными средствами и не смогут заменить надлежащего лечения. Если у вас есть проблемы со здоровьем, обязательно необходимо сначала проконсультироваться с врачом.

В качестве резюме можно сказать, что ответ на вопрос, чего больше от биологически активных добавок — вреда или пользы, — очень сильно зависит от качества препарата и от того, как вы его принимаете.

Если препарат создан из 100% натуральных растительных целебных ингредиентов, выращенных методом органического сельского хозяйства, переработан щадящим методом, качественно упакован, хранился с соблюдением необходимых требований, от него вы с высокой вероятностью получите пользу для здоровья.

Единственным противопоказанием является возможная аллергическая реакция на компоненты препарата. В любом случае нужно предварительно проконсультироваться с врачом. И конечно, важно помнить, что принимать добавку следует регулярно. Ведь результативность в данном случае обеспечивается именно накопительным эффектом.

**msn.com**

**Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК**

Мала хто разумее, што не мы ідзем па жыцці, а нас вядуць па ёй.
Ліён Фейхтвангер



# Войди в историю своего города

В жизни каждого человека случаются как радостные, так и горестные события. Ведь именно из них и складывается хроника нашей жизни, которая может быть интересна не только нам, но и нашим потомкам. Поэтому давайте вместе создавать историю нашего Слонима.

Если вы хотите, чтобы издание «Отдушина» написало о вашей свадьбе, рождении ребенка, известило о смерти ближнего и напечатало некролог под рубрикой "Войди в историю своего города", пишите нам по адресу:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, тел.: 612-26-43, 5-09-27 (тел/факс) .

## *Леанарда Рэўкоўская:*

# "АДНАЎЛЯЦЬ МОГІЛКІ НАМ ДАПАМАГАЛІ НЯБЁСЫ"

**Нарадзілася Леанарда Рэўкоўская каля вёскі Марысін Слонімскага павета Навагрудскага ваяводства на аседлі, якім валодалі яе прадзед, дзед і бацька. Яна належыць да старадаўняга шляхецкага роду Рэўкоўскіх.**

На лёс Леанарды Іосіфаўны выпала нямала выпрабаванняў, але яна іх змагла годна вытрымаць. Успамінаць пра той цяжкі час яна не хоча. Сваё жыццё яна апісала ў дзвюх кнігах, якія выйшлі на беларускай мове. Сама яна полька, жыве ў Слоніме. Яна заслужаны дзеяч культуры Польшчы, праводзіць вялікую культурніцкую працу, мае шмат узнагарод. Займалася аднаўленнем могілак польскіх салдат, якія былі пахаваны ў 1920 годзе.

Днямі ў карэспандэнта "Аддушыны" адбылася сустрэлася з Леанардай Іосіфаўнай, падчас якой жанчына распавяла пра сваё жыццё.

—Мы жылі каля вёскі Марысін Слоніскага павета. Пасля 1952 года гэтай вёскі ўжо не існавала: яе знішчылі бальшавікі. А ўсе людзі з гэтай вёскі невядома куды падзеліся. Аднойчы і майго бацьку забраў НКУС, і ён згінуў.

У 1952 годзе, калі я хадзіла ў пяты клас, ноччу да нас у хату ўварваліся НКУСаўцы, забралі і павезлі нас у невядомым кірунку. Завезлі нас у ссылку, дзе мы прабылі да 1956 года. Пасля гэтага мы не былі рэабілітаваныя. Так мой бацька стаў ворагам народа, а я — дзіцем ворага народа. Дзеці ворагаў народа ў той час не мелі права на вучобу. Таму мы павінны былі ісці працаваць. І я ў 12 гадоў пайшла на працу.

Толькі праз 40 гадоў я атрымала дакумент, што рэабілітавана. І атрымала такую паперку аб пасмяротнай рэабілітацыі бацькі, маці і сясцёр. А нас было сем дзяўчынак.

У чым мы былі вінаватыя? І ні адзін прадстаўнік улады ніколі не сказаў нам: "Прабачце за пераслед з дзяцінства, за тое, што вас абрабавалі, саслалі ў ссылку, асірацілі…" За што?

Калі вярнуліся назад у Беларусь, трэба было так прыстасавацца да жыцця, каб нас ніхто не чуў і не бачыў, — распавядала жанчына.

Потым яна пачала вучыцца ў Шчучынскім заатэхнікуме, пасля заканчэння якога пайшла працаваць.

Паходжанне Леанарды Іосіфаўны пераследавала яе доўгі час. Таму вышэйшую адукацыю прыйшлося атрымліваць ва Украіне пад другім прозвішчам.

У 1976 годзе яна з дзецьмі пераехала жыць у Слонім. З часам стварыла грамадскае аб'яднанне "Саюз палякаў на Беларусі".

**—Леанарда Іосіфаўна, як прыйшла ідэя стварыць грамадскае аб'яднанне?**

—Калі Беларусь стала самастойнай дзяржавай і мы даведаліся праз 60 гадоў, што можна ў Беларусі свабодна размаўляць на польскай мове, спяваць польскія песні, што нам дазволілі хадзіць у касцёл, то ў 1990 годзе быў утвораны "Саюз палякаў на Беларусі". І мы пачалі на Беларусі адраджаць польскую культуру, мову, традыцыі і помнікі. І мы ўвесь час толькі і рабілі, што займаліся гэтай справай, абыходзячы палітыку. І ці былі б сёння ў такім стане гэтыя могілкі, якія мы аднавілі?

**— Як пачыналася іх аднаўленне?**

—Мая прыяцелька жыве ў Польшчы, родам яна са Слоніма. Дык яна арганізавала прыезд 15 польскіх студэнтаў з Любліна разам з доктарам гістарычных навук. Студэнты чысцілі могілкі ў Слоніме. Мы забралі студэнтаў у свае сем'і і разам з імі хадзілі на могілкі наводзіць парадак.

**—А як да гэтага ставілася мясцовая ўлада?**

— Можна сказаць, ніяк, ніхто нас не падтрымліваў і ніякай дапамогі нам не аказваў. Але мы радаваліся таму, што хоць не праганялі нас. Людзі прыходзілі дапамагаць нам цэлымі сем'ямі, сярод якіх былі і шматдзетныя.

**— Значыць, каб прывесці ў належны выгляд могілкі, неабходна было, каб прыехалі польскія студэнты?**

—Яны і нас разбудзілі, бо раней мы не думалі, што гэта трэба рабіць. Пасля іх прыезду і такой цяжкай працы шмат чаго змянілася ў нашым светапоглядзе.

Потым мы пачалі аднаўляць


Леанарда Рэўкоўская

магілкі часоў Першай сусветнай вайны. Яны лепш за ўсё захаваліся пры вуліцы Школьнай. Нам удалося іх хутка ачысціць. І якое ж было наша здзіўленне, калі на гэтым вычышчаным кавалачку зямлі праз некаторы час з'явіўся крыж, ахаваны жалезным ланцугом, з фабрычна зробленай таблічкай і надпісам на рускай і нямецкай мовах: "Тут спачываюць ахвяры Першай сусветнай вайны". А вось месца, каб напісаць па-беларуску і па-польску, — не знайшлося на той шыльдачцы. Нас гэта вельмі моцна ўзбударажыла, асабіста мяне, і мы пайшлі ў райвыканкам спытаць, хто гэта зрабіў. Там нам сказалі, што не ведаюць. І нам гэта было вельмі балюча чуць.

Пры вуліцы Ружанскай могілкі зараслі больш: ад дажджу за 60 гадоў 250 салдацкіх крыжоў пазамывалася. Гэтыя могілкі былі пабудаваныя ў 1923 годзе. І мы ўсе баяліся туды ісці і не ведалі, што з намі будзе.

Першы раз мы прыйшлі туды працаваць 17 кастрычніка 1998 года. Нас прыйшло ўсяго сем чалавек. Потым я звярнулася да камбрыга Чавуса, які нам выдзеліў 10 салдат, таму што з нашым інструментам мы нічога не змаглі б там зрабіць. Патрэбна была сіла і моцныя рукі.

Прыйшоўшы туды, мы разгубіліся — там не было відаць ні аднаго крыжа, нічога не было, адны дрэвы і хмызнякі. Дзе гэтыя могілкі і крыжы? Усё зарасло. І тады сланімчанка Яніна Ялінская, якая ўжо памерла, кажа: "Давайце мы памолімся за душы гэтых салдат, якія загінулі".

Так мы пачалі ачышчаць гэтыя могілкі. Былі такія дні, калі прыходзіла дапамагаць па 40 і больш чалавек.

**—А салдат давалі вам у падмогу?**

— Давалі, але патрэбна было пісаць заяву, у якой абавязкова патрэбна было ўказаць, што я ўсю адказнасць за вайскоўцаў на час працы бяру на сябе.

**—Леанарда Іосіфаўна, што складаней за ўсё было рабіць?**

— Фізічная праца была цяжкай. Гэта не бульбу было капаць. Часам трэба было выкапаць паўтараметровыя карані і выцягнуць дрэва, на што сыходзіла па тры дні. І ўсё гэта рабілі нашы людзі. Мне нават самой не верыцца, што ў насёсць такія ахвярныя людзі.

Калі мы расчысцілі гэтыя могілкі, патрэбны былі грошы, каб замяніць крыжы, якія праляжалі ў зямлі 60 гадоў. І на гэтыя могілкі з Польшчы нават прыязджаў Генеральны сакратар польскага Савета па ахове памяці, барацьбы і пакутніцтва Анджэй Пшэвознік, які потым загінуў у авіякатастрофе пад Смаленскам. Польскія прадстаўнікі заключылі дамову з мясцовай ПМК, якая выканала працу з бракам. Але мне больш за ўсё хочацца расказаць пра людзей, якія ні ад каго не дачакаліся добрага слова. Яны прыходзілі і працавалі задарма. І я не ведаю, як ім аддзячыць.

**—Ад каго Вы чакалі гэта добрае слова?**

—Мы не рабілі нічога дрэннага. І калі я прыходзіла ў райвыканкам, казала: "Ці вам не сорамна, што ў Слоніме ў такім стане знаходзяцца могілкі? І калі мы хочам у парадак прывесці кавалачак зямлі, што ж мы дрэннага робім? Там жа людзі ляжаць, сярод якіх і нашы землякі.

Каб усё гэта аднавіць, на ўсё трэба было прасіць дазволу. Ні аднаго кроку я не зрабіла без дазволу, усё павінна я была выхадзіць, выпрасіць і выбіць. Але я нічога не зрабіла б без людзей, якім я вельмі ўдзячная.

Цяпер, калі ўсё зроблена, дык і прыемна глядзець на гэтыя могілкі. А чаго гэта каштавала людзям, якія прымалі ўдзел у іх аднаўленні?

Ведаеце, мне нават не дазволілі асвяціць крыж, які я ўстанавіла за свае грошы на Пятралевіцкай гары. Мне выкручвалі рукі за гэтую справу. Раней там быў сметнік, на які мясцовыя жыхары зносілі непатрэбныя рэчы. Я была гэтым вельмі занепакоена: хіба можна выкідаць смецце побач з месцам, дзе пахаваны людзі? Я вырашыла прадаць свой аўтамабіль і на выгандлеваныя грошы ўсталяваць крыж. Мая мара спраўдзілася. Але крыж да гэтага дня не асвечаны.

Мясцовая ўлада дала адказ (06.09.2001г. №04-18/6-86), у якім гаворыцца наступнае: "Слонімскі гарадскі выканаўчы камітэт паведамляе, што крыж пастаўлены самавольна, без адпаведнага дазволу, таму яго асвячэнне і малітву 8 верасня 2001 г. праводзіць не дазваляецца".

Душа баліць за тое, што гэта нікому не патрэбна, што ўсё гіне. Можа, таму Бог выбраў мяне, калі мой бацька згінуў, па ім ніколі не можна было паставіць нават помнік. Можа, таму мая душа балела, калі я бачыла вакол сябе, як не шануюць магілы нашых продкаў. Напэўна, Бог хацеў, каб я гэта рабіла. Столькі гадоў мы працавалі, але ні разу на нас кропля дажджу не ўпала. Гэта цуд, што ніколі нам дождж не перашкодзіў працаваць на магілках. Можа, таму, што мы пачалі з малітвы і без страху ўзяліся за гэтую справу.

…Вось так па жыцці яна, Леанарда Рэўкоўская, нясе свой крыж дабра і неабыякавасці да таго, што адбываецца ў сучасным свеце.

**Ганна ВАЛАДАШЧУК**
**Фота аўтара**

Главный редактор Виктор Владимирович Володащук

Учредитель
Виктор Владимирович ВОЛОДАЩУК

ГАЗЕТА ВЫХОДИТ НА РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Телефоны редакции:
МТС: 8-029-584-87-32
Velcom: 8-029-133-04-21
факс: 8 (01562) 5-09-27
звонить с 9.00 до 18.00
Skype — gazslon

Для корреспонденции:
231799, г. Слоним,
ул. Красноармейская, д.41
Юридический адрес:
г. Слоним, ул. Красноармейская, 41

Регистрационное удостоверение №65 от 05.03.2009 года выдано Министерством информации РБ. Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.



Тираж номера 5010 экз.

Время подписания к печати по графику 27 января 2015 года 15:00



Объем — три условных печатных листа.
Газета отпечатана в ГОУПП "Гродненская типография", Гродно, ул. Полиграфистов, 4. индекс 230025
Заказ №481

Свободная цена

ISSN 1991-3362

